**УДК 94(976)“1919/1921”**

# СТАНОВІШЧА НАСТАЎНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ (1919–1921 гг.)

***А.Г. ТРУБЧЫК***
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск**

*Даследуецца становішча настаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў час польска-савецкай вайны. Вызначаюцца асаблівасці ўмоў жыцця і працы школьных працаўнікоў, іх адносіны з уладай і насельніцтвам на акупаваных польскімі войскамі беларускіх землях, а таксама на савецкай тэрыторыі Беларусі.*

Пасля абвяшчэння БССР у студзеня 1919 г. урад рэспублікі стварыў Народны камісарыят асветы. З гэтага часу “Положение о единой трудовой школе РСФСР” пачало распаўсюджвацца на тэрыторыі краіны. Згодна з ім, школам, якія перайшлі ў распараджэнне Народнага камісарыята асветы, за выключэннем вышэйшых навучальных установ, надавалася назва “Единая трудовая школа”. Школы падзяляліся на 2 ступені: I – для дзяцей ад 8-мі да 13-ці гадоў (5-гадовы курс навучання) і II – ад 13-ці да 17-ці гадоў (4-гадовы курс). Навучанне ў школах абедзвюх ступеняў было бясплатным і абавязковым для ўсіх дзяцей адпаведнага ўзросту, агульным для хлопчыкаў і дзяўчынак. Асновай школьнага жыцця павінна была стаць праца, цесна звязаная з навучаннем, фізічным і эстэтычным выхаваннем. [1, а. 1-4].

Карэнным чынам змянялася становішча настаўніцтва. Перш за ўсё, адмянялася размежаванне выкладчыкаў па катэгорыях, замест паўрочнай аплаты працы ўводзіліся тарыфныя стаўкі, вызначаліся пяцігадовыя надбаўкі за стаж (але не больш за чатыры надбаўкі). Сумясціць педагагічную дзейнасць з працай на іншых пасадах станавілася вельмі складана. Па-за школьны заробак не павінен быў перавышаць 50% ад асноўнага аклада. Акрамя таго, дазвол ад аддзела народнай адукацыі на сумяшчэнне пасад атрымаць было амаль не магчыма. Усе школьныя працаўнікі (настаўнікі, школьныя ўрачы, інструктары фізічнай працы) павінны былі штогод перавыбірацца, згодна з дэкрэтам аб выбарнасці педагагічных і адміністрацыйна-педагагічных пасад (ад 27 лютага 1918 года). Працягласць працы настаўніка вызначалася шасцю гадзінамі ў дзень, з якіх чатыры неабходна было адводзіць на вучэбныя заняткі, а астатнія – на бягучыя школьныя справы (удзел у паседжаннях школьнага савета, дзяжурства, праверка сшыткаў і г. д.) [2, а. 9].

Практычнае ажыццяўленне “Палажэнняў аб адзінай працоўнай школе” на большай частцы беларускіх тэрыторый было спынена ў сувязі з пачаткам польска-савецкай вайны (люты 1919 г.). Абодва ўрады як савецкі, так і польскі, надавалі выключнае значэнне народнай адукацыі, якая з’яўлялася адным са сродкаў фарміравання нацыянальнай свядомасці мясцовага насельніцтва, а таксама важнейшым дзяржаватворчым фактарам. Ва ўмовах нявызначанага геапалітычнага статуса беларускіх зямель школа станавілася інструментам ідэалагічнай барацьбы.

На занятай польскімі войскамі тэрыторыі Беларусі (Віленшчына, Гродзеншчына, Брэстчына, са жніўня 1919 г. – Міншчына) была арганізавана адміністрацыйна-прававая сістэма польскіх органаў кіравання – Грамадзянскае ўпраўленне Усходніх зямель (ГУУЗ). Пытаннямі народнай адукацыі займалася секцыя асветы пры Генеральным камісарыяце. Акруговыя і павятовыя школьныя інспектараты складалі два наступныя звяна вертыкальнага адміністрацыйнага ланцуга.

З кастрычніка 1919 г. на тэрыторыі ГУУЗ пачаўся імклівы рост школ з польскай мовай навучання за кошт рэарганізацыі рускіх, яўрэйскіх і беларускіх нацыянальных школ. Толькі польскія школы атрымлівалі фінансавую падтрымку з боку дзяржавы. Школы з іншымі мовамі навучання перадаваліся на ўтрыманне мясцовага насельніцтва, якое ва ўмовах ваеннага часу не мела сродкаў і таму вымушана было згаджацца на дарэмныя польскія школы. Матэрыяльную дапамогу польскім школам аказвалі накіраваныя з Польшчы грамадскія арганізацыі, дзейнасць якіх падтрымлівалася адукацыйнымі органамі ўлады. Хуткі рост польскіх школ патрабаваў падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў.

Сітуацыю, у якой апынуліся школьныя ўлады летам 1919 г., наступным чынам апісаў школьны інспектар Брэсцкай акругі: “Калі рамонт школьных будынкаў і забеспячэнне школ неабходнымі прыладамі і падручнікамі патрабавалі каласальнай працы, то ў сто разоў цяжэй было знайсці адпаведны настаўніцкі персанал” [3, к. 1–4]. Каб падрыхтаваць мінімум 600 настаўнікаў толькі для Гродзеншчыны, былі арганізаваны 2–3-месячныя польскія педагагічныя курсы ў Беластоку, Гродна, Ваўкавыску. Летнія курсы праводзіліся таксама ў Брэсце, Кобрыне, Пружанах і Слоніме. На той час гэта лічылася самай хуткай магчымасцю забяспечыць як мага больш польскіх школ настаўнікамі. Аднак большасць з запланаваных курсаў так і не ўдалося арганізаваць “з-за адсутнасці адпаведных кандыдатаў” [3, к. 3]. Па гэтай жа прычыне і адкрыццё настаўніцкіх семінарый адкладвалася.

polotsk.su

Настаўніцкія курсы ў Ваўкавыску, арганізаваныя стараннямі галоўнага сакратара павятовай арганізацыі Польскага школьнага таварыства (ПШТ) Феліцыі Павенскай, у канцы ліпеня 1919 г., скончылі 15 чалавек. Яны заклалі падмурак развіцця польскага школьніцтва ў павеце. З афіцыйнай перапіскі ПШТ з вышэйшымі адукацыйнымі ўладамі вынікае, што на дадзеныя настаўніцкія курсы жадала запісацца значная колькасць беларускіх настаўнікаў, якім было прапанавана спачатку вывучыць польскую мову на агульных курсах. Адсутнасць перспектывы працаваць у беларускай ці рускай школе прымушала настаўніцтва шукаць пасады ў польскіх школах, арганізацыя якіх набывала даволі шырокія маштабы. Да красавіка 1920 г. у Ваўкавыскім павеце было арганізавана 68 новых польскіх школ, у якіх працавалі 83 настаўнікі і навучаліся 1822 хлопчыкі і 1216 дзяўчынак [4, а. 24].

У снежні 1919 г. Л. Зажэцкі загадаў акруговым школьным інспектарам вызначыць магчымасці арганізацыі на тэрыторыі ГУУЗ сеткі настаўніцкіх семінарый: удакладніць наяўнасць адпаведных будынкаў, падлічыць выдаткі на ўтрыманне педагагічнага персаналу і рамонт, вызначыць прыблізны колькасны, сацыяльны і нацыянальны склад вучняў і выкладчыкаў і г.д. [5] Дзяржаўным семінарыям дазвалялася працаваць толькі на польскай мове. На тэрыторыі ГУУЗ маглі ўтварацца семінарыі з іншымі мовамі навучання, аднак у гэтым выпадку аб дзяржаўных субсідыях размовы ісці не магло. У сакавіку 1920 г. у Брэсцкай акрузе дзейнічалі 2 польскія настаўніцкія семінарыі, у Віленскай – 4, у Мінскай – ніводнай [6].

Настаўніцкія курсы і семінарыі, арганізаваныя на тэрыторыі ГУУЗ, мелі выразны ідэалагічны характар. Мэтай польскай улады было выхаваць пласт прапольскі настроенага настаўніцтва. Аднак польскія чыноўнікі з недаверам ставіліся да выпускнікоў мясцовых курсаў, спасылаючыся на іх слабую падрыхтоўку.

З кастрычніка 1919 г. пачалося сістэматычнае фінансаванне з бюджэту ГУУЗ курсаў і семінарый па падрыхтоўцы настаўнікаў для "ўсходніх зямель", арганізаваных у Польшчы. Да канца 1919 г. на тэрыторыю ГУУЗ было накіравана некалькі соцен польскіх настаўнікаў. Аднак сам кіраўнік секцыі асветы Люцыян Зажэцкі прызнаваў, што гэта не вырашыла пастаўленых задач. Настаўнікі мелі вельмі нізкую кваліфікацыю, працавалі без энтузіязму, не маглі знайсці паразумення з мясцовым насельніцтвам.

На тэрыторыі Віцебскай і Гомельскай губерній, якія ўваходзілі ў склад РСФСР, працягвалі дзейнічаць савецкія працоўныя школы. У Народным камісарыяце асветы разумелі, што пры ажыццяўленні пастаўленых перад сістэмай школьнай адукацыі задач (увядзенне ўсеагульнай народнай адукацыі) непазбежна ўзнікнуць цяжкасці: "…для самого главного государственного дела – быта народного просвещения… нам понадобятся сразу многие миллиарды [рублей], и мы уверены, что получим их от центральной советской власти. Но даже если у нас не будет недостатка не только в денежных, но и в реальных средствах, нас несомненно будет огромный недостаток в учителях, разница между тем, какого учителя мы имеем и тем, какого должны иметь режет глаза. Если поставленная перед собою ясно обозначенная цель должна толкать нас браться за работу со всех концов обширного и сложного дела, то ясно, что концом, за который нужно ухватиться, прежде всего, является переподготовка учителей"[7, а. 64.]. Пад паняццем "перападрыхтоўка" меркавалася не толькі паляпшэнне адукацыйнага ўзроўня настаўнікаў, але перш за ўсё іх перавыхаванне як актыўных праваднікоў савецкай палітыкі.

Вырашэнне гэтай праблемы ўскладалася на педагагічныя курсы, якія за кароткі перыяд (ад 2 тыдняў да 2–3 месяцаў) павінны былі падрыхтаваць "сапраўднага савецкага настаўніка". Так, у маі-чэрвені толькі ў Мінскай губерні былі арганізаваны кароткатэрміновыя курсы ў Мінску, Барысаве, Мазыры, Мар'інай Горцы і Бабруйску. Галоўнай мэтай курсаў вызначалася неабходнасць азнаёміць слухачоў з новымі метадамі выкладання прадметаў у працоўных школах І-й ступені. У сувязі з гэтым, вялікая ўвага адводзілася тэарэтычнаму і практычнаму знаёмству настаўнікаў з агародніцтвам, земляробствам і жывёлагадоўляй і г. д. На тэарэтычныя заняткі па сельскай гаспадарцы адводзілася 50 вучэбных гадзін (для параўнання, на методыку выкладаня гісторыі – 6 гадзін, матэматыкі і роднай мовы – па 12), а на практыку ў майстэрнях і на вопытным полі – 180 гадзін на кожную групу. Кожныя такія курсы рыхтавалі па 200 настаўнікаў для савецкіх працоўных школ [8, с. 23-24]. Нягледзячы на тое, што сярод настаўніцтва вылучалася пэўная колькасць энтузіястаў, якія гатовы былі стаць актыўнымі функцыянерамі новай савецкай школы, значная частка школьных работнікаў насцярожана аднеслася і не адразу прыняла рэфармаванне прынцыпаў адукацыі. У № 360 газеты "Звезда" за 1919 год у артыкуле "Наше учительство" адзначалася, што настаўніцтва, па сваім ідэалагічным поглядам, падзяляецца на дзве часткі – "новае і старое". Менавіта апошняе з'яўляецца, на пагляд аўтара, асноўнай перашкодай рэфармавання школы. "Старое настаўніцтва" з недаверам ставіцца да мерапрыемстваў савецкай ўлады, не жадае працаваць творча і "па-прагрэсіўнаму" [9].

Адным з прыкладаў можна прывесці вытрымку з справаздачы аб працы школьнага пададдзела Чэрыкаўскага павятовага аддзела народнай адукацыі за 1919 г.: "*О школьных работниках. Вся работа школьного подотдела в течении 1919 года велась в направлении практического осуществления принципов о единой трудовой школе. Подотдел сразу же столкнулся с абсолютной неподготовленностью*

*шкрабов в отношении ведения новой школы. О замене старых работников новыми не приходилось и думать, так как сразу же обнаружился громаднейший недостаток учителей вследствие открытия целого ряда новых школ и новых комплектов. Пришлось оставить всех старых школьных работников и постепенно пополнять их ряды новыми элементами. Призывы шкрабов в ряды Красной Армии лишили уезд почти всех наиболее ценных и энергичных работников (мобилизировано в уезде более 90 человек). Многие школы временно пришлось закрыть, в некоторых местах школьные работники занимались поочерёдно с 2 комплектами (утром и после обеда). В таком положении пришлось назначать заместителями шкрабов лиц без достаточного образования и без педагогической практики*" [10, аа. 226–229].

Ва ўмовах ваеннага часу настаўнікі знаходзіліся ў аднолькава складаных умовах жыцця і працы і на польскім, і на савецкім баку. У маі 1919 года ў педагагічным часопісе «Школа и культура Советской Белоруссии» (орган Камісарыята народнай асветы, выдаваўся з красавіка да чэрвеня 1919 года і ў студзені – лютым 1921 года ў Мінску на на рускай, беларускай і яўрэйскай (1919) мовах) быў надрукаваны артыкул "Сельский учитель в Минской губернии". Невядомы аўтар (падпісана *К.*), на падставе дадзеных, атрыманых у выніку анкетнага апытання, якое было праведзена Мінскім губернскім аддзелам народнай адукацыі, характарызуе матэрыяльнае становішча настаўнікаў і ўмовы, у якіх прыходзілася працаваць, а таксама настроі настаўніцтва ў адносінах да сваёй працы. Прывядзём вытрымку, у якой з дапамогай колькасных дадзеных паўстае агульная карціна ўмоў жыцця і працы савецкіх школьных працаўнікоў. "72% классных помещений холодны и тесны, 63% сырых, 34% совершенно на имеют вентиляции (даже форточек). Не лучшие условия жизни сопровождают учителя в собственной квартире. 52% сельских учителей живут в наёмных помещениях, не удовлетворяющих требованиям самой примитивной гигиены. В комнатах холодно, тесно и сыро, отсутствует освещение (42% для освещения пользуются лучиной, 15% – совершенно не имеют освещения). Злополучный недостаток средств обуславливает и плохое питание учащих: 63% принимают горячую пищу только 1 раз в день, 37% отказывают себе в самых необходимых продуктах питания , 32% – в одежде. Теперь становятся понятными ухудшение здоровья 40% учителей, из которых 38% до учительства подобных жалоб не имели. Кроме того, учителям приходится отказывать себе в самообразовании и нуждах духовного характера: 67% пользуются собственными книгами или из сельской библиотеки, а 19% вовсе лишены книг, 68% не получают газет и журналов, треть из них по причине того, что в данной местности нет почты, 30% получают почту раз в месяц, 68% учителей не имеют времени для посещения театров и кинематографов и других развлечений" [11, с. 62–70]. Па дадзеным адзначаных анкет, 80% апытаных настаўнікаў не адчувалі духоўнага задавальнення ад сваёй працы. Тлумачылі яны гэта, па-першае, адсутнасцю неабходных матэрыяльных сродкаў (некаторыя настаўнікі нават схіляліся да думак аб самагубстве), а, па-другое, неразуменнем таго, як на практыцы ажыццявіць пераход да адзінай працоўнай школы: "Впереди трудная и сложная работа в новой трудовой школе, а ты не знаешь, что должна представлять из себя эта школа, Положение о школе, заметку о ней Луначарского, 2–3 брошюры кое-как добыл и прочёл, но с этим далеко не уйдёшь и новой школы не создашь. Дайте нам в достаточном количестве теоретическую литературу о новой школе, снабжайте книгами и периодическими изданиями по педагогике и вообще серьезными книгами" [11, с. 74]. Крайняя беднасць прывяла да масавага адтока прафесійных педагагічных кадраў у іншыя працоўныя сферы. Разам з тым савецкае кіраўніцтва працягвала адчыняць новыя школы і павялічваць колькасць класаў (камплектаў).

З канца 1920 г. у вырашэнні кадравай праблемы больш выразна пачалі выкарыстоўвацца адміністрацыйныя метады. Мясцовыя аддзелы народнай асветы павінны былі раўнамерна размяркоўваць педагогаў па даручаным школам. Большая частка настаўнікаў адмаўлялася ехаць на сталае месца працы ў глухія вёскі, на што губернскія органы ўлады рэагавалі па аднолькавай схеме: спачатку настаўніка папярэджвалі, затым штрафавалі, а потым на некалькі месяцаў пазбаўлялі зарплаты. У асобных выпадках настаўнікі дастаўляліся на вызначанае месца працы пры дапамозе міліцыі [12, аа. 3, 5, 12].

Матэрыяльная незабяспечанасць, расчараванне і, як вынік, адток настаўніцтва ў іншыя працоўныя сферы прывёў да катастрафічнага недахопу педагагічных кадраў ў краіне. На змену прафесійным і вопытным настаўнікам прыйшлі самавучкі і асобы, праслухаўшыя кароткатэрміновыя курсы. Зніжэнне агульнага адукацыйнага ўзроўня школьных працоўнікоў адмоўна адбілася на якасці вучэбнага працэса ў савецкіх навучальных установах. Так, у выніку інструктарскага абследавання 275-ці школ Рэчыцкага павета ў пачатку 1921 г. адзначалася, што " из всего количества учителей только 12% пригодны к работе в школе, 40% учителей могут быть полезны, если пропустить через повторные курсы. Остальным же в силу их полной непригодности опасно доверять детей надо гнать из школы. В большинстве школ обучаются только чтению, письму и счёту" [13, а. 81].

Не менш складаным было матэрыяльнае становішча настаўнікаў на тэрыторыі ГУУЗ. Мясцовыя працаўнікі няпольскіх школ вымушаныя былі спадзявацца толькі на дапамогу гміннага самакіравання. Аднак насельніцтва, абкладзенае цяжарам падаткаў, адмаўлялася ўтрымліваць школы і забяспечваць хар-

чаваннем настаўнікаў. У рэдкіх выпадках кіраўніцтва паветаў магло знайсці для настаўніка адпаведнае жыллё.

Настаўнікі, накіраваныя з семінарый і курсаў на тэрыторыю ГУУЗ, хутка расчараваліся ва ўмовах жыцця і працы на шматнацыянальных, знішчожаных вайной землях. Акрамя таго, зарплата настаўнікаў тут была ў 2–3 разы ніжэй, чым у Польшчы. Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы вызначала працоўную норму на аднаго настаўніка не менш за 30 гадзін у тыдзень (па 5–6 урокаў кожны дзень), такога ж патрабавання прытрымлівалася і секцыя асветы, аднак, калі на тэрыторыі Польшчы за кожную дадатковую гадзіну настаўнік мог атрымаць 90 марак, то на беларускіх землях толькі 25.

Кіраўніцтва секцыі асветы разумела, што прыцягнуць настаўніцкія сілы немагчыма без павышэння зарплаты. На акупаваных землях яна складала ў красавіку-кастрычніку 1919 г. 300–500 марак у месяц. Па дамоўленасці з Генеральным камісарам Е. Асмалоўскім у снежні зарплаты настаўнікам польскіх школ былі павялічаны да 700–900 марак, а з сакавіка 1920 г. сярэдняя зарплата дасягала 1000 марак у залежнасці ад кваліфікацыі і педагагічнага стажу [14]. Акрамя таго, польскім настаўнікам былі прызначаны дадатковыя выплаты і ільготы на ўзроўні дзяржаўных чыноўнікаў. Дзякуючы гэтаму, да лета 1920 г. ўдалося спыніць адток настаўнікаў на кіруючыя дзяржаўныя пасады і ў іншыя працоўныя сферы. [15].

Па распараджэнню кіраўніка секцыі асветы, са студзеня 1920 г. мясцовым настаўнікам прызначаліся наступныя выплаты: ад 700 да 800 марак у месяц кваліфікаваным настаўнікам (сельскія настаўнікі атрымлівалі на 100 марак менш за сваіх гарадскіх калег) і 300 марак часовым настаўнікам (стажорам) [16].

Кваліфікаванымі настаўнікамі агульнаадукацыйных школ на тэрыторыі ГУУЗ лічыліся тыя, хто скончыў поўны курс сярэдняй школы і атрымаў педагагічную практыку, адпрацаваўшы не менш за 3 месяцы памочнікамі кваліфікаваных настаўнікаў. Асобы з пачатковай адукацыяй таксама мелі магчымасць працаваць у школах пасля 6 месяцаў адпаведнай стажыроўкі. Аднак права на самастойную педагагічную працу не азначала для такіх кандыдатаў аўтаматычнага атрымання кваліфікацыі. На працягу пяці гадоў працы ў школах настаўнікам неабходна было вытрымаць экзамен па тэарэтычных прадметах пры дзяржаўнай настаўніцкай семінарыі. Абавязковым вызначалася веданне польскай мовы, гісторыі і геаграфіі Польшчы.

Кваліфікаванымі настаўнікамі сярэдніх школ прызначаліся пераважна асобы, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, аднак з-за надахопу спецыялістаў, настаўнік мог лічыцца кваліфікаваным, калі кіраўніцтва школы задавальнялі яго асабістыя і прафесійныя здольнасці [17].

У сакавіку 1920 г. секцыя асветы прыняла новую сістэму аплаты настаўнікаў на тэрыторыі ГУУЗ. Уводзіўся “надзвычайны дадатак” для спецыялістаў (60–100% ад зарплаты), які неабходна было выплаціць за тры папярэднія месяцы, дакладна вызначалася плата некваліфікаваным настаўнікам (не менш за 1000–1200 марак у месяц), прызначалася дадатковае ўзнагароджанне кіраўнікам школ. На органы мясцовага самакіравання ўскладалася не толькі забеспячэнне настаўнікаў жыллём, святлом і апалам, а таксама прадугледжвалася харчовая дапамога ў дакладна вызначаных памерах: 25 пудоў жыта, 30 пудоў бульбы, 4 пуды гародніны і 1 пуд тлушчу [18].

Дадзеныя змяненні павінны былі значна палепшыць матэрыяльнае становішча кваліфікаваных настаўнікаў і кіраўнікоў школ. Безумоўна гэта сістэма дадатковых выплат была распрацавана не на карысць выпускнікоў кароткатэрміновых настаўніцкіх курсаў, якія праводзіліся на тэрыторыі ГУУЗ. Гэтыя настаўнікі не мелі ні педагагічнага стажу, ні шансаў на прафесійны рост. Таму не дзіўна, што мясцовая інтэлектуальная эліта не жадала станавіцца ніжэйшай эканамічнай катэгорыяй краю, таму шукала заробкаў у іншых сферах.

Такім чынам, у перыяд польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.) настаўніцтва знаходзілася ў складаных умовах жыцця і працы. На польскім і на савецкім баку назіраўся адыход настаўніцтва ў іншыя працоўныя сферы. Працягваючы арганізацыю новых школ, польскае кіраўніцтва заахвочвала настаўнікаў шляхам паступовага падняцця зарплаты. Савецкая ўлада для забеспячэння школ настаўнікамі больш схілялася да ідэалагічных і адміністрацыйных метадаў. Абодва ўрады выдалялі з педагагічнай сферы настаўнікаў, якія не адпавядалі дзяржаўнай ідэалогіі. У выніку перавыбараў педагагічных кадраў, якія адбываліся на савецкай частцы беларускіх зямель, большасць вопытных кваліфікаваных настаўнікаў была заменена выпускнікамі кароткатэрміновых педагагічных курсаў. На тэрыторыі, акупаванай польскімі войскамі, няпольскае настаўніцтва не пазбаўлялася працы, аднак пакідалася без фінансавання. Дзяржаўную дапамогу атрымлівалі ў асноўным польскія школы, у якія накіроўваліся настаўнікі, якія скончылі педагагічныя семінарыі або кароткатэрміновыя курсы ў Польшчы і Галіцыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Трудовая школа. Положение об Единой Трудовой Школе РСФСР. – Смоленск : типогр. Нар. Обр. Зап. ком., 1918. – 16 с.

2. Декрет и положение Совнаркома о бюджете и оплате труда школьных работников; инструкции и циркуляры Наркомпросса ССР о порядке составления смет по народному образованию (ноябрь 1918 – март 1919 гг.) // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 526. Воп. 1. Спр. 2.
3. Sprawozdanie rzeczowe Inspektoratu Szkolnego Okręgu Brzeskiego za czas swego istnienia od 3.04.1919 r. do 29.09.1920 r. // Biblioteka Publiczna m. st. Warszawy, Dział Starych Druków i Rękopisów, Zarząd Cywilny Ziem Wshodnich. – Akc. 1773/10/ IV.
4. Statystykaszkół powszechnych (1919–1920) // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 310. Воп. 1. Спр. 22.
5. Okólnik Szefa Sekcji Oświecenia Publicznego Komisarjatu Generalnego Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich do Inspektorów szkolnych okręgowych, 3 grudnia 1919 r. // Dziennik Urzędowy ZCZW. – 1919. – № 4 (11 grud.). – P. 463.
6. SzkolnictwonaKresachWschodnich // Biblioteka Publiczna m. st. Warszawy, Dział Starych Druków i Rękopisów, Zarząd Cywilny Ziem Wshodnich. – Nr. akc.1680, к. 15.
7. Декреты и постановления СНК и Наркомпроса РСФСР о единой трудовой школе, программы секционных заседаний и тезисы к докладам на IВсеросийском съезде работников просвещения (1919 г.). // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1.
8. Пара слов о школьной реформе // Звезда. – 1919. – С. 4.
9. Рин, И. Наше учительство / И. Рин // Звезда. – 1919. – С. 1.
10. Циркуляры и распоряжения Гомельского губоно (1920-1921 гг.) // Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 84.
11. Сельский учитель в Минской губернии // Школа и культура Советской Белоруссии. – 1919. – № 3–4. – С. 65–75.
12. Протоколы заседаний коллегий уездных отделов народного образования и отчëты о деятельности губернских и уездных отделов (1920 г.) // Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 37.
13. Циркуляры и распоряжения Гомельского губоно (1920–1921 гг.) // ДАГВ. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 84.
14. Rozporządzenie Komisarza Generalnego Ziem Wschodnich w przedmiocie uregulowania płac nauczycieli szkół powszechnych, 16 marca 1920 r. // Dziennik Urzędowy ZCZW. – 1920. – № 22 (16 marca). – poz. 545.
15. Zarzecki, L. Rzut okana całość działalności Sekcji Oświecenia Publicznego w Wilnie, Toruń, 12 stycznia 1921 r. / L. Zarzecki // Biblioteka Publiczna m. st. Warszawy, Dział Starych Druków i Rękopisów, Zarząd Cywilny Ziem Wshodnich. – Nr. akc.1773/ 6/ II, к. 58-64.
16. Okólnik Szefa Sekcji Oświecenia Publicznego Komisarjatu Generalnego Zarądu Cywilnego Ziem Wschodnich do Inspektorów szkolnych okręgowych, 12 stycznia 1920 r. // Dziennik Urżędowy ZCZW. – 1920. – № 3 (17 stycz.). – poz. 33.
17. Rosporządzenie tymczasowe Komisara Generalnego Ziem Wshodnich, dotyczące szkolnictwa i oświaty, 11października 1919 r. // Dziennik Urżędowy ZCZW. – 1919. – № 31 (18 listop.). – P. 340.
18. Rozporządzenie Komisara Generalnego Ziem Wschodnich w predmiocie uregulowania płac nauczycieli szkół powszechnich, 16 marca1920 r. // Dziennik Urżędowy ZCZW. – 1920. – № 22 (16 marca). – poz. 545.

## THE STATUS OF TEACHERS ON THE TERRITORY OF BELARUS DURING THE POLISH-SOVIET WAR (1919–1921)

***A. TRUBCHIK***

*The article is dedicated to teaching position at the territory of Belarus during the Polish-Soviet War (1919–1921). The author determines the particular conditions of life and work of school employees, their relations with the authorities and the population in the occupied lands of the Polish troops of Belarus, as well as in the Soviet Belarus.*

Polotsk SU